■ Спорт-тайм

# За самааддачу і майстэрства

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра першую перамогу беларускай футбольнай зборнай у адборачным да чэмпіянату свету турніры, выніку Кубка Еўропы ў бегу, які прайшоў у Мінску, і трыумф міні-футбольнага клуба «Сталіца», што заваяваў галоўны тытул краіны.**

**1.** ***Футбалісты зборнай Беларусі атрымалі першую перамогу ў кваліфікацыі чэмпіянату свету — 2018.*** У матчы 6-га тура групы А беларусы на полі «Барысаў-Арэны» абыгралі каманду Балгарыі — 2:1. Лік адкрыў Міхаіл Сівакоў, рэалізаваўшы пенальці, павялічыў перавагу Павел Савіцкі.



Фота БЕЛТА.

*— Хачу павіншаваць усіх балельшчыкаў з першай у адборы перамогай! Падзякаваць хлопцам за самааддачу, майстэрства, дакладнае прытрымліванне плана на гульню,* — сказаў на пасляматчавай прэс-канферэнцыі **галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Ігар КРЫВУШЭНКА.** *— У першым тайме мы добра рухаліся, прэсінгавалі, не давалі сапернiку прастору. У другім, праўда, трохі задыхнуліся, прыціснуліся да сваіх варот, дазволілі балгарам згуляць у ціск і падаваць навесы. Тым не менш усё ж сабраліся, адсунулі гульню ад сваіх варот. А тут яшчэ шыкоўны гол Савіцкага падаспеў. Рады за Паўла і за іх узаемадзеянне з Лапцевым, добры атрымаўся тандэм.*

У іншых матчах кваліфікацыйнай групы А зборная Швецыі дамаглася валявой вікторыі над камандай Францыі — 2:1, футбалісты Нідэрландаў у Ратэрдаме без праблем перайгралі Люксембург — 5:0. Турнірнае становішча пасля 6 тураў: Швецыя — 13 ачкоў, Францыя — 13, Нідэрланды — 10, Балгарыя — 9, Беларусь — 5, Люксембург — 1.

Матчы 7-га тура адбудуцца 31 жніўня. Зборная Беларусі згуляе ў Люксембургу, балгары прымуць шведаў, а французы галандцаў.

Адзначым, што ўчора ўвечары на сталічным стадыёне «Трактар» наша нацыянальная каманда правяла таварыскі матч з новазеландцамі.

**2.** ***Вольга Мазуронак заняла другое месца ў Кубку Еўропы ў бегу на 10 000 м у Мінску.*** Беларуска пераадолела дыстанцыю за 32 хв. 13,73 сек., апярэдзіць нашу спартсменку змагла толькі Сара Марэйра з Партугаліі.

*— З сапернiцай было складана канкурыраваць. Яна лідар у Еўропе ў гэтым відзе. Сара Марэйра нават засталася незадаволеная часам, паказаным у Мінску,* — адзначыла пасля фінішу Вольга Мазуронак.

У камандным заліку ў жанчын першае месца заняла зборная Беларусі. Акрамя Вольгі яшчэ дзве беларускія спартсменкі фінішавалі ў дзясятцы наймацнейшых. Святлана Кудзеліч паказала пяты вынік, шостае месца заняла Анастасія Іванова, Ніна Савіна завяршыла гонку 12-й, Людміла Ляховіч — 19-й, Таццяна Стэфаненка — 31-й.

Найлепшым з беларускіх мужчын стаў Уладзіслаў Прамаў — 11-е месца.

**3.** ***Мінскі клуб «Сталіца» стаў чэмпіёнам Беларусі па міні-футболе.*** На пляцоўцы палаца спорту «Уручча» ў трэцім паядынку фінальнай серыі мінскія футбалісты разграмілі гомельскі ВРЗ з лікам 6:0.

Гэта другі поспех «Сталіцы» ў чэмпіянатах краіны — першыя залатыя ўзнагароды былі заваяваны ў 2014 годзе. Уладальнікам «бронзы» стаў «Лідсельмаш» з Ліды.

**4.** ***Гандбалісткі зборнай Беларусі няўдала правялі першы матч барацьбы за права выступіць у фінальнай стадыі чэмпіянату свету — 2018.*** Падапечныя Томажа Чатэра саступілі камандзе Чарнагорыі 26:33, нягледзячы на тое, што перад перапынкам вялі тры мячы.

Сустрэча ў адказ адбудзецца 15 чэрвеня ў мінскім палацы спорту «Уручча».

**5.** ***Хакеісты «Пітсбурга» абыгралі на выездзе «Нэшвіл» з лікам 2:0 і сталі ўладальнікамі Кубка Стэнлі.*** «Пінгвіны» выйгралі фінальную серыю да чатырох перамог — 4:2 і другі год запар сталі ўладальнікам самага прэстыжнага клубнага хакейнага трафея.

Нападнік і капітан пераможцаў Сідні Кросбі таксама другі год запар прызнаны самым каштоўным гульцом у плэй-оф і атрымаў прыз «Кон Смайт Трофі». Ён набраў 27 (8+19) ачкоў у 24 матчах на выбыванне.



Нагадаем, «Пітсбург» пяты раз у сваёй гісторыі выйграў ганаровы тытул. Раней гэты клуб перамагаў у фінале плэй-оф НХЛ у 1991, 1992, 2009 і 2016 гадах.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
lobazhevich@zviazda.by

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.42 | 17.05 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.40 | 17.21 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.33 | 17.06 |
| Гомель — | 4.33 | 21.20 | 16.47 |
| Гродна — | 4.54 | 21.56 | 17.02 |
| Брэст — | 5.04 | 21.47 | 16.43 |

### Месяц

*Поўня 9 чэрвеня. Месяц у сузор'і Вадалея.*

### Імяніны

*Пр. Ермія.*
*К. Вольгі, Антона, Германа, Люцыяна.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 13 ЧЭРВЕНЯ

**1447** год — заснаванне гарадскога пасёлка Радашковічы. Да гэтага года адносіцца першае дакументальнае згадванне, звязанае з заснаваннем касцёла Святой Тройцы. У 1569 годзе пасёлак атрымаў магдэбургскае права. У XVI стагоддзі Радашковічы лічыліся каралеўскім уладаннем, пазней належалі Глябовічам, Агінскім, Масальскім, Радзівілам. Вясной 1708 года ў Радашковічах адбыліся перамовы паміж шведскім каралём Карлам XII і польскім каралём Аўгустам Моцным. У 1903 годзе тут жыў Янка Купала.

**1702** год — нарадзіўся Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька, дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, мецэнат. Абудаваў Нясвіж і Нясвіжскі замак пасля разбурэння шведамі,ператварыў горад у адміністрацыйны цэнтр усіх уладанняў Радзівілаў. Заснаваў у Нясвіжы тэатр, друкарню, адкрыў корпус кадэтаў, які рыхтаваў афіцэраў. Падтрымліваў існуючую і адкрываў новыя мануфактуры, у тым ліку Слуцкую мануфактуру шаўковых паясоў, а таксама ў Міры і Альбе — па вырабе габеленаў. Памёр у 1762 годзе.

**1895** год — у Францыі завяршыліся першыя ў свеце аўтамабільныя гонкі на хуткасць па трасе Парыж—Бардо—Парыж агульнай працягласцю каля 1200 кіламетраў. З 46 удзельнікаў, якія ўзялі старт у гэ-



тых спаборніцтвах, 29 выкарысталі аўтамабілі з бензінавымі рухавікамі, 15 — з паравымі і толькі два — з электрычнымі. Пераможцам спаборніцтва стаў Эміль Левасор. Ён без зменшчыка пераадолеў дыстанцыю прабегу на сваёй машыне Panhard-Levassor за 48 гадзін 47 хвілін, з сярэдняй хуткасцю 24,4 км/гадзіну. На жаль, у 1897 годзе Эміль загінуў у аўтакатастрофе падчас гонак Парыж—Марсэль. У Парыжы яму пастаўлены помнік, на пастаменце якога высечаны словы, сказаныя Левасорам адразу пасля заканчэння гонкі Парыж—Бардо—Парыж: «Гэта было вар'яцтва! Я гнаў на скорасці да трыццаці кіламетраў у гадзіну!»

**1962** год — нарадзіўся Ігар Эдуардавіч Адзярыха, беларускі вучоны ў галіне кардыялогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Аўтар навуковых даследаванняў па распрацоўцы і ўкараненні ў клінічную практыку новых метадаў лячэння атэратрамбозу, уплыву фізічных фактараў на структурна-функцыянальны стан біялагічных тканак і біямалекул.

**1977** год — нарадзіўся (г. Мінск) Аляксей Калюжны, беларускі спартсмен (хакей з шайбай), нападаючы, заслужаны майстар спорту Беларусі. У складзе нацыянальнай зборнай каманды Беларусі заняў 4-е месца на XIX зімовых Алімпійскіх гульнях (2002 год). Чэмпіён свету сярод маладзёжных каманд. Чэмпіён і неаднаразовы прызёр першынстваў Беларусі і Расіі.

### Было сказана

**Блез ПАСКАЛЬ, французскі матэматык, фізік, літаратар і філосаф:**

*«Ёсць дастаткова святла для тых, хто хоча бачыць, і дастаткова цемры для тых, хто не хоча».*

## УСМІХНЕМСЯ

Дачы, два суседы:

— Слухай, ты калі збіраешся пазыку мне аддаваць?

— Якую пазыку?

— Ну, твае пчолы на маіх кветках нектар збіраюць, а мёду я не бачу.

— Добра, скажу ім, каб у цябе не збіралі. Збірай сам!

**Падкажыце, а на фота можна як-небудзь эфект «скваспных вачэй» прыбраць?**

— Дарагі, я табе адбіўнушак да гарэлачкі насмажу. Будзеш?

— Вядома! Я толькі пра іх і думаю.

— Як? А пра мяне?!

— Ну вядома, і пра цябе! Гэта ж ты абяцала адбіўнушак насмажыць.

**Гарадская бальніца пасля працяглых і беспаспяховых спроб знайсці прыбіральшчыцу была пераўтворана ў гразелячэбніцу.**

— Ну, і як першая шлюбная ноч?

— Не памятаю! Я прытомнасць страціў ужо пасля таго, як яна вейкі адклеіла...

**— Апішыце сваю знешнасць...**

**— Прывыкнуць можна!**


caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2266.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 чэрвеня 2017 года.